# § 21. Расійская дзяржава ў XVI ст.

1533 г. 1549 г. 1550 г. 1565 г. 1584 г.

**Успомніце.** *Чаму Масква стала цэнтрам «збірання рускіх зямель»? Якое значэнне мела для Рускай дзяржавы «стаянне на рацэ Угры»? Якую ролю ў гісторыі Маскоўскага княства адыграў Іван III?*

У другой палове XV — пачатку XVI ст. завяршылася аб'яднанне рускіх паўночна-ўсходніх зямель вакол Масквы. Русь вызвалілася ад ардынскай залежнасці. Склалася адзіная Расійская дзяржава. З сярэдзіны XVI ст. яе афіцыйна называлі Расійскім царствам, у Заходняй Еўропе — Масковіяй. У гэты ж час узнікла назва «Расія». Правіцелі маладой Расіі ўмацоўвалі цэнтральную ўладу і пашыралі межы сваёй дзяржавы, вялі актыўную барацьбу за выхад да цёплых мораў.

**Вы даведаецеся.** *Якія змены адбыліся ў Расіі падчас кіравання Івана IV. Чаму Іван IV атрымаў празванне Грозны.*

**1. Пачатак кіравання Івана IV.** У ***1533 г.*** на рускі трон уступіў ***Іван IV***. Вялікаму князю было толькі тры гады. Дзяржавай цвёрда і рашуча кіравала яго маці Алена Глінская. З баярамі яна мала лічылася, фізічна знішчыла прэтэндэнтаў на велікакняскі трон — братоў свайго нябожчыка мужа Васіля III. Аднак малалетні князь нядоўга знаходзіўся пад абаронай маці. Яна памерла (верагодна, была атручана), калі яму споўнілася 8 гадоў.

Пачалася барацьба за ўладу, якая пераходзіла з адных баярскіх рук у другія. Патаемныя забойствы і перавароты былі тады звычайнаю з'явай. Хлопчык з ранняга дзяцінства прызвычаіўся бачыць жорсткасць і гвалт. У трынаццацігадовым узросце юны князь сам вынес першы смяротны прысуд: па яго загадзе быў забіты князь Андрэй Шуйскі.

Алена Глінская была ўраджэнкаю Вялікага Княства Літоўскага, паходзіла са знатнага роду. У Маскоўскім княстве Алена апынулася разам са сваімі родзічамі, што збеглі з ВКЛ пасля паражэння мяцяжу 1508 г. Алена была жанчынай дзівоснай прыгажосці, вясёлага характару і добра адукаванай. Гэтыя вартасці прыцягнулі ўвагу маскоўскага князя Васіля, і яна стала яго жонкай. У сямейнай пары нарадзілася двое дзяцей — Іван і Георгій. Паміраючы, Васіль благаславіў на царства Івана, а Алене наказаў часова кіраваць дзяржавай да ўзмужнення сына.



Алена Глінская.
Рэканструкцыя па чэрапе.
Аўтар *Сяргей Нікіцін*. 1999 г.

199—204

Напачатку 1547 г. Іван IV быў абвешчаны царом (ад лац. caesar — цэзар). Яго тытул (ганаровае званне) гучаў так: «Гасудар, цар і вялікі князь усяе Русі». Царскі тытул прыроўніваў Івана IV да еўрапейскіх правіцеляў, узвышаў яго над шматлікімі рускімі князямі. Але ў кіраванні краінай амаль нічога не змянілася. Усімі справамі па-ранейшаму распараджаліся баяры. У той час як баяры змагаліся за ўладу, народ пакутаваў ад

**З ліста Івана IV пра дзяцінства**

207—209

Засталіся мы з братам Георгіем круглымі сіротамі, ніхто нам не дапамагаў, баяры атрымалі, што хацелі, — царства без правіцеля, да нас жа ніякага клопату сардэчнага не выказалі. І чаго яны толькі не ўчынілі! Скарбы маці перанеслі ў казну, пры гэтым бязлітасна штурхаючы нагамі і тыкаючы ў іх кіямі, і падзялілі паміж сабой. Нас жа з братам маім пачалі выхоўваць, як апошніх жабракоў. Нам не ставала нават адзення і ежы. Нам ні ў чым не давалі волі, абыходзіліся з намі не як з дзецьмі… А казну дзеда нашага і бацькі нашага забралі сабе і на грошы тыя накавалі для сябе залатога і срэбранага посуду.

*Паразважайце, якія рысы характару маглі сфарміравацца ў Івана IV у такіх умовах.*



Цар Іван IV Грозны.
Мастак *Віктар Васняцоў*.
1897 г.

надмерных падаткаў. Людзі адкрыта праяўлялі сваё незадавальненне ўладай.

Становішча асабліва абвастрылася ў выніку стыхійнага бедства — у Маскве адбыўся страшэнны пажар. Каля 80 тыс. гараджан засталіся без прыстанішча і маёмасці. Успыхнула масавае паўстанне. Народ патрабаваў ад маладога цара кіраваць краінай па справядлівасці.

**2. Выбраная Рада і яе рэформы.** Маскоўскі пажар і паўстанне 1547 г. рэзка змянілі лёс Івана IV. Цар вырашыў навесці парадак у краіне: спыніць свавольства баяр і ўмацаваць цэнтральную ўладу. Ён наблізіў да сябе групу таленавітых людзей і стаў раіцца з імі па ўсіх пытаннях унутранай і знешняй палітыкі. Гэтае бліжэйшае атачэнне цара называлася Выбранаю Радай (ад слова «радзіць»). Абапіраючыся на яе, Іван IV ажыццявіў шэраг дзяржаўных рэформаў.

У 1549 г. у Расіі ўпершыню быў скліканы ***Земскі сабор*** — сход прадстаўнікоў усіх пластоў насельніцтва (акрамя прыгонных сялян).

*Паразважайце, ці можна Земскі сабор у Расіі назваць саслоўна-прадстаўнічым органам. Прывядзіце два аргументы на карысць вашай высновы.*

Члены Баярскай думы, вышэйшае духавенства, служылыя людзі (якія знаходзіліся на дзяржаўнай службе), а таксама выбарныя прадстаўнікі ад гараджан і дзяржаўных сялян абмяркоўвалі з царом два пытанні — аб новым царскім Судзебніку і аб рэформах Выбранай Рады.

Выбраная Рада рэфармавала цэнтральнае кіраванне. Ствараліся пастаянныя органы ўлады — прыказы. Кожны з іх загадваў асобным родам дзяржаўных спраў. Пасольскі прыказ займаўся сувязямі з іншымі дзяржавамі, Памесны — размеркаваннем і ўлікам зямель баяр і дваран, Разрадны — службовымі справамі баяр, дваран і г. д.



Стральцы.
Мастак *Сяргей Іваноў*. 1907 г.

*Ці былі карысныя для Расійскай дзяржавы рэформы Івана IV? Патлумачце свой пункт гледжання.*

204—205

У 1550 г. быў складзены новы ***Судзебнік*** — агульнарасійскі звод законаў. Судзебнік узмацніў царскую ўладу і пацвердзіў існаванне для сялян права Юр'ева дня, калі яны маглі перайсці да іншага памешчыка, выплаціўшы за гэта пэўную суму. У тым жа годзе было створана напаўрэгулярнае стралецкае войска, аснашчанае агнястрэльнай зброяй — пішчалямі. Стральцы атрымоўвалі жалаванне. Яны жылі з сем'ямі і маглі займацца сельскай гаспадаркай або рамяством. У асобнае саслоўе вылучалася дваранства. Сістэма «кармленняў» (утрыманне службовых асоб за кошт мясцовага насельніцтва) была замененая на агульнадзяржаўны падатак.

Такім чынам, у перыяд кіравання Івана IV пачалося ўмацаванне самадзяржаўнай, гэта значыць неабмежаванай, улады цара. Угэты ж час аформіліся асноўныя саслоўі. Феадальную арыстакратыю складалі князі і баяры. Гасудару за грошы і маёнткі служылі дваране. Маёнткі заставаліся ў вярхоўнай уласнасці цара і гэтым адрозніваліся ад спадчынных зямельных уладанняў — вотчын. Паступова дваране-памешчыкі зрабіліся асноўным апірышчам царскай улады. Асобнымі саслоўямі з'яўляліся духавенства, чарнасошныя сяляне (асабіста вольныя, якія неслі павіннасці на карысць дзяржавы), прыватнаўласніцкія сяляне, а таксама пасадскія людзі — гараджане.

Дваранства, як і астатнія саслоўі, выступала за моцную дзяржаўную ўладу. У асобе ж баяр, занятых міжусобнай барацьбой за ўплыў і захаванне сваіх прывілеяў, малады цар бачыў небяспечных сапернікаў.

**3. Ваенныя паходы Івана Грознага.** Іван IV праводзіў актыўную знешнюю палітыку. Важнае месца ў ёй займалі паходы ва ўрадлівыя землі Паволжа.




Асноўныя кірункі знешняй палітыкі Івана Грознага

*З дапамогай схемы пералічыце асноўныя задачы знешняй палітыкі Івана Грознага. Выкарыстоўваючы карту, вызначце, якія выгады давала далучэнне гэтых зямель. Інтарэсы якіх дзяржаў маглі быць закранутыя?*

Спачатку ён скарыў падуладныя Казанскаму ханству народы: мардву, чувашоў, удмуртаў, башкіраў, а затым і само Казанскае ханства (1552). У 1556 г. рускія войскі без бою захапілі Астрахань — найбуйнейшы порт і гандлёвы цэнтр Астраханскага ханства. Напрыканцы свайго кіравання Іван Грозны прыступіў да заваявання Сібірскага ханства. Пачатак рускаму асваенню Сібіры паклаў паход Ермака Цімафеевіча Аленіна на чале казацкага войска.

Пасля поспехаў на Усходзе Іван IV звярнуў увагу на Захад. Ён імкнуўся заваяваць выхад да Балтыйскага мора і дабіцца права вольнага гандлю з Еўропай праз Балтыку. Аднак выхад да Балтыйскага мора кантраляваўся Лівонскім ордэнам. Апрача таго, інтарэсы Расіі на гэтым напрамку сутыкнуліся з інтарэсамі Польшчы, Вялікага Княства Літоўскага і Швецыі. Такім чынам, вайна за Балтыку была непазбежнай. У гісторыю яна ўвайшла пад назвай Лівонскай (1558—1583 гг.).

Пачатак вайны быў паспяховым для Расіі. Рускія войскі прайшлі ўсю Лівонію, авалодалі Нарвай і Дэрптам (Юр’евам). Лівонскі ордэн як дзяржава фактычна распаўся. Але неўзабаве ў вайну за землі ордэна ўступілі Рэч Паспалітая (аб’яднаныя Польскае каралеўства і ВКЛ) і Швецыя. Расія не магла вытрымаць доўгага супрацьстаяння з гэтымі дзвюма дзяржавамі. У выніку вайна за землі Лівонскага ордэна і адпаведна за Балтыйскае ўзбярэжжа была прайграная.




Расійская дзяржава ў другой палове XVI ст.

*Знайдзіце на картасхеме тэрыторыю Расійскай дзяржавы ў сярэдзіне і ў канцы XVI ст. З апорай на картасхему высветліце, якія землі ўвайшлі ў склад Расіі да канца XVI ст., а якія да гэтага ж часу былі страчаны.*

**4. Апрычніна і яе наступствы.** Ваенныя няўдачы, неўтаймаваны нораў цара прывялі да змянення сістэмы кіравання ў краіне. Ліквідавалася Выбраная Рада, пачаліся ганенні на баяр. У 1565 г. краіна была падзелена на дзве часткі. Адна частка — асабісты ўдзел Івана IV — называлася апрычнінай (ад слова «опричь» — апроч, асобна). Яна кіравалася самім царом, які абапіраўся на апрычнае войска — апрычнікаў, набраных з людзей нязнатнага паходжання. Так

фарміравалася своеасаблівая прыватная гвардыя цара. З тэрыторыі апрычніны былі выселеныя сотні баярскіх сем'яў, а іх землі адышлі апрычнікам. Астатняя частка Расійскай дзяржавы атрымала назву земшчына. На яе тэрыторыі ўсімі землямі распараджаліся баяры, а справамі — Баярская дума.

Асноўнай мэтаю апрычніны было ўмацаванне цэнтральнай улады ў барацьбе супраць удзельных князёў і свавольных баяр. Абапіраючыся на апрычнікаў, Іван IV пачаў жорсткае пераследаванне сапраўдных і ўяўных праціўнікаў, за што атрымаў празванне «Грозны».

205—207

У 1570 г. на чале апрычнага войска Іван Грозны пайшоў на Вялікі Ноўгарад, западозрыўшы там здраду. Некалькі тыдняў горад падвяргаўся рабаванню і спусташэнню, людзей забівалі без разбору. Той жа лёс чакаў і Пскоў, і толькі дзівам яго жыхары здолелі адкупіцца.

Апрычніна насіла супярэчлівы характар. З аднаго боку, яна ліквідавала палітычную раздробленасць і ўзмацніла самадзяржаўную ўладу цара. З другога боку, аслабіла Рускую дзяржаву і выклікала агульнае незадавальненне розных пластоў насельніцтва. Многія сяляне і гараджане былі даведзеныя да галечы. У краіне пачаліся голад і разруха. У давяршэнне ўсіх бед у 1571 г. на Маскву напалі крымскія татары. Апрычнае войска, што страціла сваю баяздольнасць, не змаг-



Апрычнік. Павялічаны малюнак з паддона падсвечніка пачатку XVII ст.

Апрычнікі насілі чорную вопратку, да сёдлаў іх коней былі прымацаваныя сабачыя галовы і венікі — сімвалы гатоўнасці «грызці» гасударавых здраднікаў і «вымятаць» усякую здраду з дзяржавы. Апрычнікі прыносілі цару клятву ў вернасці, абяцаючы, у прыватнасці, жыць асобна ад «земскіх» людзей. Для ўтрымання апрычнікаў было прызначана каля 20 асобых гарадоў. Нават у самой Маскве ў іх распараджэнне былі аддадзены некаторыя вуліцы, а жыхары з іх перасялены. Найбольш вядомым апрычнікам быў дваранін Малюта Скуратаў, які праславіўся сваёй жорсткасцю. Народ называў яго «вяльможным катам».

ло абараніць сталіцу, якая была разрабаваная і спаленая. У выніку Іван Грозны ў 1572 г. скасаваў апрычніну.

Іван Грозны кіраваў да ***1584 г.*** Памёр ён у 53 гады. Нягледзячы на свае самадурства і жорсткасць, у народных песнях і казках цар Іван Васільевіч паўстае як абаронца Русі ад знешніх ворагаў і самавольства баяраў-ліхаімцаў.

*Такім чынам, палітыка Івана Грознага на першапачатковым этапе яго кіравання была паспяховай. Цар здолеў правесці рэформы, умацаваць цэнтральную ўладу і нават пашырыць межы Расійскай дзяржавы. Пры ім тэрыторыя краіны вырасла ўдвая і склала 5,4 млн км$^2$. Але яму не ўдалося пераадолець адмоўныя наступствы апрычніны і Лівонскай вайны, што і прывяло да грамадзянскай вайны ў Расіі ў пачатку XVII ст.*

***Ключавыя словы:*** *Іван IV, Выбраная Рада, Земскі сабор, Судзебнік, апрычніна.*

**Пытанні і заданні**

**1.** Раскажыце, у якіх умовах рос Іван IV і як ён прыйшоў да ўлады.

**2.** Запоўніце табліцу «Рэформы Выбранай Рады».

| | **Рэформа цэнтральнага кіравання** | **Рэформа мясцовага кіравання** | **Судовая рэформа** | **Вайсковая рэформа** |
|---|---|---|---|---|
| Змест рэформы | | | | |

Зрабіце вывад, якім чынам названыя рэформы паўплывалі на ўладу цара.

**3.** З дапамогай схемы на с. 148 і картасхемы на с. 149 ахарактарызуйце асноўныя кірункі і вынікі знешняй палітыкі Івана IV. Чаму для Расіі быў так важны выхад да Балтыйскага мора?

**4.** Што такое апрычніна? З якой мэтай і якімі метадамі праводзілася гэтая палітыка?

**5.** Патлумачце, чаму ў канцы праўлення Івана Грознага ў Расійскай дзяржаве пачаліся голад і разруха.